**Н. Ю. Паўлоўская**

# ЗАГАЛОВАК ЯК СЕМАНТЫКА-ПРАГМАТЫЧНАЕ ЯДРО НАВУКОВАГА ДЫСКУРСУ

У сучасных умовах пашырэння і ўскладнення камунікацыі існуе неабходнасць дакладнай і адэкватнай трансляцыі велізарнага пласта навуковай інфармацыі ў часе і прасторы, магчымасць аператыўна яе трансліраваць і атрымліваць. Формамі навуковай дзейнасці служаць тэксты розных жанраў, аб'яднаныя гіперонімам *функцыянальны стыль навукі*.

З камунікатыўна-прагматычнага пункту погляду гэты стыль можна трактаваць у якасці аднаго з тыпаў інстытуцыянальнага дыскурсу (У. І. Карасік). У рамках паняцця *інстытуцыянальны навуковы дыскурс* вылучаюцца акадэмічны (уласна навуковы), навукова-вучэбны, навукова-публіцыстычны, навукова-інфармацыйны і іх падтыпы. Далейшае структураванне можна весці ў рэчышчы тэорыі поля, якая адпавядае паняццю *сістэма* ці *падсістэма.* З гэтых пазіцый жанравая іерархія навуковых тэкстаў можа выглядаць наступным чынам: першасныя структуры навуковага выкладу – манаграфіі, артыкулы, дысертацыіі – складаюць ядро поля, другасныя формы – даклады, падручнікі, рэфераты, рэцэнзіі, водзывы, анатацыі, рэзюмэ і інш. – утвараюць яго прыядзерную зону і перыферыю (Р. С. Алікаеў, А. С. Траянская). Межы паміж ядром і перыферыяй нетрывалыя, вар'іруюцца ў кожнай канкрэтнай галіне навукі, абумоўлены экстралінгвістычнымі – гістарычнымі (развіццё ці змена навуковай парадыгмы), сацыяльна-эканамічнымі (падзеі ў грамадстве), суб'ектыўнымі (пункт погляду і паводзіны аўтара) прычынамі.

Магчымы больш падрабязны падзел навуковых жанраў на разнавіднасці. Да прыкладу, навуковы артыкул у залежнасці ад камунікатыўнай задачы і структурна-кампазіцыйнай спецыфікі чляніцца на артыкул-паведамленне аб выніках даследавання, уласна артыкул, перадавы артыкул, дыскусійны (палемічны артыкул), навукова-публіцыстычны, аглядны ці рэкламны артыкул (Р. С. Алікаеў, А. А. Бажэнава).

Навуковы дыскурс будуецца ў адпаведнасці з рэалізацыяй інфа-рмацыйнай праграмы стваральніка – аўтара. Ён дэманструе свой погляд на навуковую (дысцыплінную) карціну свету, носьбітам якой з'яўляецца і адрасат. Пры гэтым адрасанту і адрасату належыць знаходзіцца ў адэкватных прэсупазіцыях: як удзельнікі камунікацыі яны знаёмыя з агульным пластом навуковых ведаў і тэкстаў, а абмен думкамі выкліканы патрэбамі развіцця навуковых ідэй, што ў выніку вядзе да карэкціроўкі, удакладнення ці змены агульнай навуковай карціны свету.

Аўтар А. С. Траянская імкнецца да адпаведнага ўспрымання навуковага твора чытачом, і для гэтага навуковы дыскурс у знакавай фіксацыі пісьмовага тэксту павінен мець дакладную кампазіцыйную структуру, экспліцытна паслядоўнае выяўленне лагічных сувязей, завершанасць доказаў, акцэнтуацыю ўвагі на тэксце, а не на дзеячы, рацыянальную адназначнасць тлумачэння без магчымых варыянтаў сэнсавага зместу, падкрэсленую неэмацыянальнасць.

Артыкул як найбольш пашыраны жанр навуковага стылю мае наступныя кампазіцыйныя элементы (у іншай тэрміналогіі – субтэксты): а) загаловак і падзагаловачны комплекс з інфармацыяй аб аўтары, анатацыяй і ўступам; б) асноўную частку, пададзеную ў залежнасці ад камунікатыўных мэтаў аўтара ў якасці паведамлення, апісання, разважання, дыскусіі; в) заключэнне і бібліяграфічныя спасылкі, аформленыя ў спісы выкарыстанай літаратуры і крыніц даследавання.

Загаловак навуковага твора – гэта сінтаксічна аформлены па пэўнай мадэлі згорнуты дыскурсіўны знак, які служыць сродкам выражэння пэўнага метазместу (В. Ю. Варзапава). У загалоўку ў сціслым выглядзе змяшчаецца інфармацыя аб асноўным аб'екце апісання, а таксама часта знаходзіцца месца элементы новых ведаў – іх прыметы, функцыі, эксплікаваныя прэдыкатам. Гэта першы пункт кантакту аўтара і чытача, таму назва артыкула павінна быць дакладнай, празрыстай, максімальна інфарматыўнай – яна дае задзел (зарад) усяму навуковаму артыкулу. Загаловак навуковага твора мае амбівалентны характар: з аднаго боку рэпрэзентуе аб'ектываваныя веды, з другога – змяшчае суб'ектыўны погляд аўтара на праблему, які можа сумяшчацца з агульнапрынятай тэорыяй ці адрозніваецца ад яе. Гэтыя ацэначныя (модусныя) сэнсы, рэпрэзентаваныя рацыянальнымі і, рэдка, эмацыянальнымі, экспрэсіўнымі маркерамі, могуць увасабляцца ў непрамыя (неканвенцыянальныя) паказчыкі, якія адрасат павінен дамысліваць.

Загаловак разам з падзагаловачным комплексам выконвае розныя функцыі: сістэмна-структурныя, семантычныя, камунікатыўна-прагматычныя, дзе задаецца агульная навукова-лінгвістычная стратэгія аўтара.

У структурных адносінах пераважная большасць прааналізаваных загалоўкаў на беларускай мове – гэта намінатыўныя сказы: *дэйктычныя дзеясловы ў беларускай і англійскай мовах (параўнальна-супастаўляльны аспект)*; *валітыўнасць (на мяжы рэальнасці і ірэальнасці)*; *спецыфіка эмпірычнай аргументацыі ў беларуска- і рускамоўнай гуманітарыстыцы*; *мадэлі глыбінных сэнсаў і іх мадальная рэалізацыя ў мастацкім дыскурсе*; *нацыянальна-кагнітыўныя фактары лексікалізацыі субстантыўных форм множнага ліку*.

Вельмі рэдка з мэтай палемічнай завостранасці загаловак беларускага навуковага артыкула можа фармуляваецца як пытальны сказ: «*Ці сучасна сучаснае мовазнаўства?*» «*Пра што мараць жанчыны і чаго хочуць мужчыны: досвед асацыятыўнага эксперыменту*»; «*Палітычная карэктнасць у англійскай мове: даніна модзе ці аб'ектыўная рэальнасць?*» «*Што ёсць нормай у мадальнай прасторы беларускай мовы?*» ці падавацца цытатай з адзнакай прэцэдэнтнасці: *«Двое яны як адна з'ява». Творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа у мастацкай рэцэпцыі Алеся Разанава*.

Агульная семантычная функцыя загалоўкаў – змястоўная канкрэтызацыя прадметна пададзенага дзеяння: прэдыкатыўная прымета фармулюецца як існаванне падзеі, сітуацыі ў адцягненасці ад іх носьбітаў ці дзеячоў. З'яўляючыся семантычна неаднамерным, загаловак выступае як імя дыскурсу і сігналізуе пра галоўныя сэнсавыя элементы навуковага твора, тым самым забяспечваючы больш-менш адэкватнае прадстаўленне аб ідэі і пазіцыі аўтара. У загалоўку змяшчаюцца найбольш важныя, з пункту погляду

стваральніка навуковага дыскурсу, словы для перадычы яго асноўнага зместу. Адрасант вызначае не толькі выбар назвы, але і свядома прагназуе ўспрыманне тэксту адрасатам, выклікаючы яго інтарэс і эксплікуючы імпрэсіўнасць (стварэнне ўражання) і атрактыўнасць (успрыманне на аснове станоўчых пачуццяў).

Прагматычныя функцыі загалоўка грунтуюцца на структурна-семантычных, сінтаксічных паказчыках яго складнікаў у іх узаемасувязі і ўзаемаўплыве з камунікатыўнымі інтэнцыямі аўтара, увасобленымі ў такта-стратэгічную арганізацыю ўсяго навуковага артыкула. Інтэнцыя забяспечвае танальнасць загалоўка, аб'ектывуе выкарыстанне моўных сродкаў, вызначае асобу адрасанта, рэгулюе ўзаемадзеянне з чытачом. З дапамогай рознаўзроўневых моўных сродкаў аўтар навуковага артыкула ажыццяўляе дзве галоўныя дыскурсіўныя стратэгіі – інфармаванне і ўздзеянне, вызначаныя інфармацына-аргументатыўнай арганізацыяй твора, маючы на мэце ўзбагаціць ці змяніць навуковую карціну свету суразмоўцы.

Эфектыўнымі тактыкамі асноўных стратэгій загалоўкаў у навуковых артыкулах выступаюць імкненне аўтара эксплікаваць ісцінасць прапазіцыі выказвання, прагназаванне вынікаў даследавання, актуалізацыя фонавых ведаў, апеляцыя да рацыянальнай ацэнкі, гатоўнасць да супрацоўніцтва (устанаўлення кантакту) у прафесійна арыентаванай супольнасці.

У заключэнне адзначым, што загаловак навуковага артыкула, як малафарматны дыскурс, выступае дамінантай у логіцы яго пабудовы, рэпрэзентуе аб'ектыўную інтэнцыю ва ўзаемадзеянні з аўтарскай задумай, мае багаты сістэмна-структурны, семантычны і камунікатыўна-прагматычны патэнцыял, скіраваны на аператыўнае азнаямленне са змястоўнай сутнасцю аднаго з тыпаў інстытуцыянальнага дыскурсу.